Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
________________ Ю. П. Бондар
«____»____________ 2014 г.
Рэгістрацыйны № ВД-____/ баз.

# ГРЫМ

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2014

**СКЛАДАЛЬНІК**

*К. В. Мамацюк,* дацэнт кафедры тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*У. А. Мішчанчук*, дэкан тэатральнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў», заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, прафесар;

*І. А. Алекснiна,* дацэнт кафедры тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 23.04.2014 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 18.06.2014 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: К. В. Мамацюк

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна з'яўляецца важнай часткай працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў па спецыяльнасці 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць і непасрэдна звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці», «Аматарская творчасць», «Сцэнарна-рэжысёрскія асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці» і г.д. У працэсе вывучэння дысцыпліны студэнты атрымліваюць неабходныя тэарэтычныя і практычная веды па тэхналогіі грыміроўкі.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – пазнаёміць студэнтаў з мастацтвам сцэнічнага афармлення і змены знешнасці акцёра пры дапамозе грыміравальных фарбаў, пластычных налепак, пастыжорскіх наклеек у адпаведнасці з трактоўкай вобраза, навучыць іх сучасным прыёмам грыміроўкі, прывіць добры густ і навучыць студэнтаў ствараць знешняе аблічча персанажа сродкамі грыму на сцэне.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

1) пазнаёміць студэнтаў з гісторыяй развіцця грыміравальнага мастацтва і лепшымі дасягненнямі ў гэтай галіне выдатных майстроў беларускай, рускай і другіх замежных сцэн;

2) растлумачыць ролю і значэнне грыму ў стварэнні мастацкага вобраза ў цеснай сувязі з задумай рэжысёра культурна-адпачынкавых праграм;

3) навучыць тэхналогіі грыміроўкі;

4) навучыць карыстацца грыміравальнымі фарбамі, налепкамі і наклейкамі;

5) пазнаёміць з санітарна-гігіенічнымі правіламі пры грыміроўцы.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны *ведаць:*

– гісторыю развіцця грыму ад антычнасці да сучаснасці;

– сучасны тэатральны працэс, асновы жывапісу;

– тэхналогію выканання грыму;

*умець:*

– самастойна вырашаць і выконваць грым;

– самастойна абіраць тып грыму адпаведна сітуацыйным запатрабаванням;

– самастойна абіраць самае характэрнае і выразнае пры стварэнні сцэнічнага вобраза.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*валодаць:*

– асноўнымі тэхнікамі і прыёмамі выканання грыму;

– акцёрскімі і рэжысёрскімі здольнасцямі знешняга выражэння сцэнічнага вобраза;

– здольнасцямі да мастацка-вобразнага мыслення.

*Методыка выкладання.* На першых лабараторных занятках выкладаецца тэарэтычны матэрыял і паказваецца грым адной палавіны твару на адным студэнце. Студэнты канспектуюць (а па магчымасці фатаграфуюць працэс грыміроўкі) і па чарзе грыміруюць другую палавіну твару студэнта. На другіх лабараторных занятках студэнты дзеляцца на пары і самастойна грыміруюць твары партнёраў пад наглядам выкладчыка.

У межах вывучэння дысцыпліны «Грым» мяркуецца правядзенне студэнтамі самастойнай работы па азнаямленні з асноўнай і дадатковай літаратурай па грыме, з выданнямі перыядычнага друку па праблемах гісторыі, тэорыі і практыкі грыміравальнага мастацтва, наведванне тэатральных спектакляў дзяржаўных і прыватных устаноў культуры, фестываляў тэатральнага мастацтва ў Рэспубліцы Беларусь.

Вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Грым» усяго прадугледжана 82 гадзіны, з якіх 42 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 2 гадзіны, лабараторныя – 40 гадзін. Рэкамендаваная форма кантролю – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | лабараторныя |
| **Тэма 1.** Кароткі агляд гісторыі грыму | 2 | 2 | |
| **Тэма 2.** Анатамічныя асновы грыму | 4 | | 4 |
| **Тэма 3.** Узроставы грым | 6 | | 6 |
| **Тэма 4.** Карэкціровачны грым | 6 | | 6 |
| **Тэма 5.** Нацыянальны грым | 4 | | 4 |
| **Тэма 6.** Скульптурна-аб'ёмныя прыёмы грыміравання з выкарыстаннем гумозу ў вострахарактарным казачным грыме | 4 | | 4 |
| **Тэма 7.** Спецыяльны грым: казачны грым жывёл | 10 | | 10 |
| **Тэма 8.** Спецыяльны грым: цыркавыя клоўны | 4 | | 4 |
| **Тэма 9.** Спецыяльны грым: шрамы, раны, сінякі | 2 | | 2 |
| **Разам…** | **42** | **2** | **40** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Тэма 1. Кароткі агляд гісторыі грыму

Прадмет і задачы курса «Грым». Грым як творчы працэс, адзін з завяршальных этапаў працы акцёра над роллю. Значэнне грыму ў тэатры і ў канцэртнай зале. Грым як кампанент спектакля, канцэрта і святочнага відовішча. Садзейнічанне грыму задачы данясення да гледача мастацкай задумы драматурга, сцэнарыста, рэжысёра і акцёра. Грым – гэта знешняе пераўвасабленне акцёра, заснаванае на ўнутраным пераўвасабленні, арганічнае яднанне выразнай формы са зместам. Рэлігійныя абрадавыя святы, «магічная» расфарбоўка цела чалавека. Рытуальна-абрадавыя маскі на тэрыторыі Беларусі. Маскі старажытных тэатраў Грэцыі і Рыма. Умоўны, сімвалічны грым кітайскага тэатра і японскага тэатра «Кабукі».

Паўмаскі і грым італьянскай камедыі дэль артэ. Схаластычны, упрыгожваючы грым прыдворнага арыстакратычнага французскага тэатра. Акцёр Франсуа-Жазэф Тальма як адзін з заснавальнікаў рэалістычных тэндэнцый у грыме. Рэалістычны грым У. Самойлава, А. Ленскага, К. Станіслаўскага, Ф. Шаляпіна, і М. Чаркасава. Зацвярджэнне Маскоўскім мастацкім акадэмічным тэатрам рэалістычнага грыму ў сцэнічным мастацтве.

### Тэма 2. Анатамічныя асновы грыму

Агульны тон. Упадзіны і выпукласці чэрапа чалавека. Блікі. Грым чэрапа чалавека. Знаёмства з будовай чэрапа чалавека. Асноўныя косці чарапной каробкі: клінавідная, патылічная, цемянная, скроневыя і лобная. Асноўныя косці чэрапа: скулавыя, косці носа, верхняя і ніжняя сківіцы. Асноўныя ўпадзіны чэрапа: лобная, дзве скроневыя, дзве падскулавыя, дзве падсківічныя, дзве вокавыя і адна насавая. Асноўныя выпукласці чэрапа: два лобных бугры, дзве надброўныя дугі, дзве скулы са скулавымі дугамі, насавая косць, падбародачны бугор, два вуглы ніжняй сківіцы і зубы. Лінеарнасць і аб’ёмнасць у грыме чэрапа. Лінія як сродак падкрэслівання меж касцей і ўпадзін чэрапа. Паўцень як сродак аб’ёмнага стварэння выпуклых касцей і ўпадзін чэрапа. Блік як сродак аб’ёмнага падкрэслівання выпукласцей і стварэння фактуры косці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 3. Узроставы грым

Тыповыя прыкметы чалавека сталага ўзросту. Уплыў узросту, навакольнага асяроддзя, месца пражывання, стану здароў’я на колер твару і рук. Шэра-васковыя колеры фарбаў для грыму старога чалавека. Прапрацоўка ўпадзін твару растушоўкай і пальцамі. Узмацненне маршчын растушоўкай фарбамі грыму. Носагубная маршчына як асноўная на твары старога чалавека. Маршчыны лба, упадзіны і маршчыны вачэй, упадзіна падбародка. Асіметрычнасць маршчын у сталым узросце як адбітак жыцця і характару на твары сталага чалавека. Тэхналогія нанясення сівізны.

## Тэма 4. Карэкціровачны грым

Агульны тон у жаночым і мужчынскім карэкціровачным грыме. Каноны прыгажосці. Румяны як сродак падкрэслівання і змянення формы твару. Падводка вачэй з мэтай павелічэння і надання ім выразнасці. Запудрыванне і абнаўленне грыму. Выбар колеру пудры і паслядоўнасць запудрывання. Пудра як сродак фіксацыі фарбаў грыму на твары, наданне яму матавасці і мяккасці. Асаблівасці грыміравання пры выступленні акцёра пры дзённым і тэатральным асвятленні.

## Тэма 5. Нацыянальны грым

Агульны тон і адцяняльныя фарбы пры грыміраванні мангалоіднай і негроіднай рас. Расавыя і нацыянальныя прыкметы. Асаблівасці формы галавы еўрапейца, мангола і негра. Розніца іх знешнасці ў колеры і фактуры валасоў, скуры, формы вачэй, броваў, носа і скул. Наклейванне штучных вусоў, барод і броваў з крэпэ ў персанажах мангалоіднай і негроіднай рас. Спосаб нанясення вадкіх грыміравальных фарбаў (марылкі) для афарбоўкі рук і шыі ў негрыцянскім грыме.

## Тэма 6. Скульптурна-аб’ёмныя прыёмы грыміравання з выкарыстаннем гумозу ў вострахарактарным казачным грыме

Спецыяльны грым. Казачныя персанажы: грым Кашчэя, Бабы-Ягі, Снежнай каралевы. Выкарыстанне гумозу, парыкоў, крэпэ, бліщчынак на вочы, лаку для зубоў. Перавага адной асноўнай рысы характару: каварства Кашчэя, хітрасць Бабы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ягі, фанабэрыстасць Снежнай каралевы. Гранічнае завастрэнне гэтых характэрных рыс казачнага вобраза ў грыме.

**Тэма 7. Спецыяльны грым: казачны грым жывёл**

Жывапісныя размалёўкі твару. Лінейны і графічны характар размалёўкі казачных персанажаў: тыгра, лісы, сабакі, кошкі і г.д.

**Тэма 8. Спецыяльны грым: цыркавыя клоўны**

Жывапісная размалёўка твару плямамі і лініямі. Прымяненне колеру ў чыстым выглядзе (без пераходаў і адценняў тону).

**Тэма 9. Спецыяльны грым: шрамы, раны, сінякі**

Выкарыстанне імітацыі крыві. Паталагічныя змяненні на твары. Сінякі і пабоі на целе. Нябрытасць. Выкарыстанне калодыю, сандарачнага лаку, чорнага лаку для адсутнасці зубоў, латэксу, жэлацiну, ваты і алегніна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*

1. *Авдеев, А. Д.* Происхождение театра / А. Д. Авдеев. – М. ; Л. : Искусство, 1959. – С. 39–256.

2. *Когтев, Г. В.* Грим и сценический образ / Г. В. Когтев. – М. : Сов. Россия, 1981. – С. 5–111.

3. *Бейган, Ли.* Грим для театра, кино и телевидения / Ли Бейган. – М. : Искусство, 1997. – С. 5–172.

4. *Станиславский, К. С.* Моя жизнь в искусстве / К. С. Станиславский. – М. : Вагриус, 2000. – 448 с.

5. *Станиславский, К. С.* Работа актера над собой : в 2 ч. / К. С. Станиславский. – М. : Искусство, 1985. – Ч.1. Работа актера над собой в творческом процессе переживания. Дневник ученика. – 479 с.

6. *Станиславский, К. С.* Работа актера над собой : в 2 ч. / К. С. Станиславский. – М. : Искусство, 1990. – Ч.2. Работа актера над собой в творческом процессе воплощения. Дневник ученика. – 508 с.

7. *Сыромятникова, И. С.* Искусство грима и макияжа / И. С. Сыромятникова. – М. : РИПОЛ-классик, 2005. – 272 с.

8. *Школьников, С. П.* Основы сценического грима / С. П. Школьников. – Минск : Выш. шк., 1976. – С. 38–149.

*Дадатковая*

1. *Анджан, А.* Грим в кино / А. Анджан, Ю. Волчанецкий. – М. : Искусство, 1957. – С. 91–109.

2. *Вархолов, Ф. В.* Грим / Ф. В. Вархолов. – М. : Сов. Россия, 1964. – 103 с.

3. *Кухаронак, Т. І.* Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск : Ураджай, 2001. – 239 с.

4. *Логинова, В. А.* Заметки художника-гримера / В. А. Логинова. – М. : Искусство, 1978. – 88 с.

5. *Львов, Н. А.* О гриме / Н. А. Львов. – М. : Сов. Россия, 1969. – 110 с.

6. *Сыромятникова, И. С.* История прически / И. С. Сыромятникова. – М. : Искусство, 1983. – 231 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. *Тэатральная* Беларусь: энцыклапедыя: у 2 т. / пад агул. рэд. А. В. Сабалеўскага. – Мінск : БелЭн, 2002–2003. – Т.1: А–К, 2002. – 568 с. : іл. ; С. 317–320.

8. *Черкасов, Н. К.* Записки советского актера / Н. К. Черкасов. – М. : ВТО, 1976. – С. 15–177.

9. *Школьников, С. П.* Прически, головные уборы и украшения для сцены / С. П. Школьников. – Минск : Выш. шк., 1975. – 222 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў накіравана на ўзбагачэнне іх уменняў і навыкаў у вольны ад абавязковых вучэбных заняткаў час. Мэта самастойнай работы студэнтаў – садзейнічанне засваенню ў поўным аб’ёме зместу вучэбнай дысцыпліны праз сістэматызацыю, планаванне і кантроль уласнай дзейнасці. Выкладчык дае заданні па самастойнай рабоце і рэгулярна кантралюе іх выкананне.

З улікам зместу, мэты, задач дысцыпліны студэнтам прапануецца ажыццяўляць такія віды самастойнай работы па дысцыпліне, як распрацоўка самапрэзентацыі і тэматычных прэзентацый (у тым ліку ў час і пасля наведвання спектакляў), азнаямленне з публікацыямі па тэорыі і практыцы выканання грыму.

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійнай кампетэнцыі, кантролю і самакантролю ведаў студэнтаў кафедры сацыяльна-культурнай дзейнасці па дысцыпліне «Грым» выкарыстоўваецца дыягнастычны інструментарый, які мае рознаўзроўневы характар і выкарыстоўваецца комплексна:

1. Творчыя практычныя заданні па стварэнні рэалістычнага, узроставага, спецыяльнага і казачнага грыму, якія прадугледжваюць не толькі аналітычную працу з першакрыніцамі (манаграфіі, тэарэтычныя працы па тэорыі стварэння грыму, журналы і інш.), але і выкарыстанне ўменняў самастойнага вобразнага мыслення.
2. Вуснае апытанне студэнтаў у час правядзення заняткаў.
3. Залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ГРЫМ**

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2014. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,70. Ул.-выд. арк. 0,33. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ